# ШКОЛЬНАЯ ПЛАНЕТА

ГУО «Средняя школа № 2 г. Березино»

Дом, у якім утульна ўсім! schoolberezino2.edu.minskregion.by





*ДУА «Сярэдняя школа № 2 г. Беразіно»* *№ 1 (люты)*


# «КАК ЗДОРОВО, ЧТО ВСЕ МЫ ЗДЕСЬ СЕГОДНЯ СОБРАЛИСЬ»

**Пад такой назвай ужо не першы год актавая зала СШ № 2 збірае пад сваім дахам выпускнікоў розных гадоў.**

**У гэты дзень у кожнага з нас ёсць выдатная магчымасць успомніць вясёлыя, бестурботныя гады, праведзеныя ў родных сценах, хоць на момант вярнуцца ў дзіўны свет дзяцінства і юнацтва, кахання і надзей.**



**Школа – гэта дошка, спісаная мелам, строгія настаўнікі, згублены дзесьці дзённік, бацькоўскія натацыі, першае каханне. Асвяжыць у памяці гэтыя моманты школьнага жыцця дапамагае былым вучням калектыўна-творчая праца сённяшніх вучняў 6-11 класаў. Створаны сумеснымі намаганнямі праект – гэта своеасаблівае падарожжа ў мінулае. Сабраныя фотаздымкі розных гадоў у выглядзе прэзентацыі з хуткасцю святу пераносяць нас у школьную пару, ствараюць святочны настрой, саграваюць душу, выклікаюць усмешку на тварах.**



**Традыцыйны школьны вечар сустрэчы – гэта доўгачаканы і хвалюючы момант. Традыцыйнасць вызначанага свята нашай школы заключаецца яшчэ і ў тым, што гасцямі і ўдзельнікамі мерапрыемства становяцца выпускнікі-юбіляры, якія пакінулі ўстанову з апошнім званком пяць, дзесяць, дваццаць, сорак, шэсцьдзясят гадоў назад.**

**Не можа не радаваць тое, што выпускнікі не забываюцца на родную ўстанову, а яна ў сваю чаргу ганарыцца сваімі вучнямі і заўсёды чакае сустрэчы з імі.**

# СТУДЗЕНЬСКІ АБ'ЕКТЫЎ













**1 - шосты дзень;**
**2 і 3 - валанцёрскі рух;**
**4 - сустрэча з беларускай пісьменніцай В.А. Буланда.**

*ЧЫТАЦКІ ФАРМУЛЯР*

## "ПІСЬМО Ў РАЙ"



Алесь Савіцкі прыйшоў да высновы, што ў многім да дэградацыі грамадства прывяла страта спрадвечных маральных і духоўных каштоўнасцей, пазбаўленне ў жыцці правільных арыенціраў на карысць ілюзорных, выпадковых. Ёсць пра што задумацца. Такім роздумам і напоўнены яго раман-споведзь "Пісьмо ў Рай". Галоўны герой Андрэй Смоліч, які аднолькава добра раскрыў свае творчыя здольнасці і як пісьменнік, і як журналіст, спавядаецца перад самым блізкім чалавекам – бацькам. Ануфрый Смоліч загінуў у гулагаўскім лагеры. Да яго і звяртаецца сын, праз адлегласць і смугу часу дасылаючы свой ліст у Рай.

Споведзь аўтара — глыбока псіхалагічная, сатканая з роздуму і разваг героя, нашага сучасніка, які сіліцца спасцігнуць глыбінную сутнасць падзей грамадскіх, што зніатаваны з лёсам асабістым і хвалююць сёння кожнага з нас.

**ЗАПРАШАЕМ ДА СУПРАЦОЎНІЦТВА ВУЧНЯЎ І НАСТАЎНІКАЎ!**

ГУО «Средняя школа № 2 г. Березино»
ШКОЛЬНАЯ ПЛАНЕТА
**ДУА «Сярэдняя школа № 2 г. Беразіно»** 223311, горад Беразіно, вуліца Мультана, 19.
**Эл. пошта: berezinosch2.edu@tut.by**
**Сайт:schoolberezino2. edu.minskregion.by**
Клуб «Юны журналіст»

# СВЯЦІ,КАХАННЯ ЧЫСТАЯ ЗАРА!



*Дзень святога Валянціна, або Дзень усіх закаханых - свята, якое 14 лютага адзначаецца многімі людзьмі па ўсім свеце.*

***Паліна (8 клас):***
- Дзень святога Валянціна лічыцца святам усіх закаханых. У гэты дзень усе дораць адзін аднаму паштоўкі-валянцінкі, кветкі. Я таксама буду віншаваць сваіх сяброў валянцінкамі, зробленымі сваімі рукамі. Гэтае цудоўнае свята адзначу сямейным кругам. Дзень святога Валянціна - самае пяшчотнае і рамантычнае свята.

**- Як ты ставішся да свята Дзень святога Валянціна?**
- Добра, і я хачу, каб у ва ўсіх у гэты дзень быў добры настрой.
**- Што табе вядома пра гэта свята?**
- Ні для каго не сакрэт, што існуе цэлая азбука колераў, з дапамогай якіх 14 лютага закаханыя выказваюць свае пачуцці.

**Яўгенія (8 клас)**

**- Што ты ведаеш пра Дзень святога Валянціна?**
- 14 лютага ўсе закаханыя адзначаюць свята.
**- Як ты ставішся да падобнага свята?**
- Добра. Таму што ў гэты дзень кожны мае магчымасць прызнацца адзін аднаму ў каханні.
**- Каго будзеш віншаваць?**
- Сваіх родных.

***Кацярына (5 клас)***

**- Што ты ведаеш пра свята Дзень святога Валянціна?**
- Вядома, што 14 лютага ў Англіі дораць прысмакі.
**- Каго хацела б павіншаваць?**
- Бацькоў і сяброў. А валянцінкі для іх буду рабіць сама.
**- Якім чынам адзначыш гэтае свята?**
- Хацелася б схадзіць з сябрамі ў кіно.

***Ганна (5 клас)***

## КАХАЙЦЕ І БУДЗЬЦЕ КАХАНЫМІ ЗАЎЖДЫ!

**- Што ты ведаеш пра Дзень святога Валянціна?**
- У гэты дзень усе дораць адзін аднаму «валянцінкі». Пасапраўднаму святочным гэты дзень з’яўляецца для закаханых.
**-Каго хацелася б павіншаваць?**
- Сяброў і блізкіх.

***Кацярына (5 клас)***



# ЦІ ВЕДАЛІ ВЫ, ШТО...

...у **Англіі** Дзень святога Валянціна павялося святкаваць, пачынаючы прыкладна з 17 стагоддзя. Традыцыю дарэння кветак англічане перанялі ў французаў у пачатку 18 стагоддзя. Самай папулярнай у закаханых у Дзень святога Валянціна ў Англіі з'яўляецца чырвоная ружа. Легенда кажа, што багіня кахання Афрадыта наступіла на белы куст руж і, параніўшыся, афарбавала ружы ў чырвоны колер.

...у **Саудаўскай Аравіі** святкаванне Дня святога Валянціна забаронена пад пагрозай вялікіх штрафаў.

...**палякі** кожны год 14 лютага наведваюць метраполію Познані - месца захоўвання мошчаў святога Валянціна (мясцовыя паданні). Паломнікі вераць, што наведванне яе дапаможа ім сустрэць сапраўднае каханне.

...**французы** - самая рамантычная нацыя, любяць дарыць каштоўнасці. Яны першымі ўвялі ў сябе любоўныя пасланні - чатырохрадкоўі і надаюць асаблівую ўвагу "валянцінкам" - маленькім любоўным паштовачкам. У самы рамантычны дзень робяцца прапановы замужжа.

...у **Даніі** людзі пасылаюць адзін аднаму засушаныя белыя кветкі без подпісаў.

...у **Тайвані** ў Дзень святога Валянціна прынята дарыць жанчынам ружы. Значэнне мае колькасць. Калі мужчына дасылае адну кветку, значыць, ён прызнаецца ў каханні, а калі раскошны букет са 100 руж - прапаноўвае выйсці замуж.

...у дахрысціянскай **Кіеўскай Русі** было сваё свята закаханых, прысвечанае Купалу - язычніцкаму славянскаму богу, сыну Перуна, які адзначаўся ў пачатку лета. Ён быў звязаны з легендарнай гісторыяй кахання Пятра і Феўронні. Такім чынам, царкоўнымі заступнікамі сям'і і шлюбу лічацца святыя Пётр і Феўронія.




У студзені на базе СШ № 3 горада прайшлі раённыя спаборніцтвы па зімнім мнагабор'і **"Абаронца Айчыны"**. У мерапрыемстве прынялі ўдзел СШ № 2, СШ № 3, Паплаўская і Любушанская школы. Гульні працягваліся больш за дзве гадзіны. Прызёрамі сталі - Аляксей Кушнер (першае месца па кулявой стральбе, асабістае першае месца ў мнагабор'і), Васіль Ярмолін (трэцяе месца па кулявой стральбе і ў падцягванні), Мікалай Усніч (асабістае трэцяе месца ў мнагабор'і. Пераможцы былі ўзнагароджаны дыпломамі. У турніры па лыжных гонках каманда нашай установы заняла першае месца ў раёне.

Віншуем пераможцаў!

***У ГАСЦЯХ У ПСІХОЛАГА***

# ПРОСТА НАЗІРАЙЦЕ...

Насуперак легендзе нос і вушы ад хлусні не растуць, хіба толькі ледзь-ледзь. Існуюць больш надзейныя спосабы выяўлення маны. Як сцвярджаюць псіхолагі нашай школы, ілгуна можна выкрыць па яго вачах. Фокус у тым, што за праўдзівую інфармацыю і выдумку адказваюць розныя аддзелы мозгу. Сігнал, які ідзе ў адзін з іх, актывізуе па шляху мноства нервовых канчаткаў. А гэта прымушае чалавека рэфлекторна рухаць вачыма. Калі суразмоўца ўспамінае, напрыклад, табліцу множання, яго вочы міжвольна скошваюцца направа. А калі ён збіраецца складна схлусіць, вочы пачынаюць глядзець налева. Паўтары яшчэ раз: налева - хлусня, направа - усё па-сапраўднаму. Цяпер можна і паназіраць за субяседнікамі!

**Дарэчы, свае пытанні можна штодзённа ананімна задаць псіхолагу, даслаўшы іх на адрас электроннай пошты berezinosch2.edu@tut.by. Вы абавязкова атрымаеце адказ і не застанецеся сам-насам з цяжкасцямі. Памятайце, любая праблема мае вырашэнне!**